# ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

УДК 008-028.78-043.96(=161.3)

*П. А. Гуд, Н. І. Гуд*

## Новыя народзіны традыцыйнай святочнай культуры Беларусі: традыцыі і навацыі, тэндэнцыі развіцця

*На пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя ў суверэннай Беларусі паўстала задача адраджэння духоўных каштоўнасцей, ідэалаў быцця, ад якіх многія пакаленні беларусаў былі адчужаны. Значэнне гэтай працы заключаецца не толькі ў захаванні і аднаўленні традыцыйнай культуры, але ў разуменні яе важнай ролі як гаранта існавання этнасу.*

У памежным паміж Усходам і Захадам, раз'ядналым постсавецкім беларускім грамадстве, трапіўшым пад уздзеянне сённяшніх глабалізацыйных працэсаў, менавіта народная культура дае людзям магчымасць адчуць паяднанне між сабой, прыналежнасць да сваёй, адрознай ад іншых супольнасці. Працяглы час бадай што адзіным захавальнікам сваёй спрадвечнай мовы і культуры заставаліся сяляне ды асобныя колы спецыялістаў-філолагаў, літаратараў, дзеячаў культуры і мастацтва. Апошнім часам да беларушчыны актыўна далучаецца маладое пакаленне. У грамадстве распачата, на чале найперш інтэлектуальнай эліты, пачэсная справа вывядзення нацыянальнай культуры з вузкіх, да сёння абмежаваных сфер яе функцыянавання на «шырокі прастор» – да ўсіх слаёў грамадства і да прызнанага дзяржавай яе прыярытэту. Сцісла ахарактарызуем зрухі на гэтым годным шляху, у прыватнасці ў развіцці святочнай культуры Беларусі на аснове адраджэння яе важкай складовай часткі – традыцыйных свят, ушанаваных людзьмі з пакалення ў пакаленне.

Напрыканцы першага года дзяржаўнай незалежнасці Вярхоўным Саветам быў прыняты Закон «Аб святочных днях у Рэспубліцы Беларусь» (19 снежня 1991 г.), і дзяржаўны святочны каляндар папоўніўся агульнапрызнанымі народам, спрадвечнымі святамі – Дзень памяці (Дзяды), Народзіны Хрыстовы (Каляды), Вялікдзень (Пасха), Радаўніца. Быў распачаты працэс, у якім мелася на мэце захаванне і адраджэнне традыцыйных народных свят каляндарнага цыкла і стварэнне новых святочных формаў на аснове культурна-гістарычнай спадчыны. Такім чы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нам, быў стабілізаваны народны святочны каляндар і паўсюдна атрымалі распаўсюджанне святы ўсіх каляндарных цыклаў (Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Юр'е, Сёмуха, Купалле, Зажынкі, Дажынкі, Пакровы). Шырыцца правядзенне штогодніх святочных кірмашоў, рыцарскіх турніраў (г. п. Мір, 1995), фестываляў сярэднявечнай культуры (г. п. Мір, 1995). З'яўляюцца новыя святочныя формы: Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» (1992), Міжнародны фестываль духоўнай музыкі «Магутны Божа» (г. Магілёў, 1992), Усебеларускі фестываль народнага гумару «Аўцюкі» (1995), Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (г. Паставы, 1997) і інш. Акрэслілася і актывізавалася тэндэнцыя трымацца хрысціянскіх святочных традыцый (ладзяцца святы хрысціянскага календара, фестывалі духоўнай музыкі, містэрыі, дабрачынныя акцыі для дзяцей-сірот, інвалідаў і інш.).

Кожны рэгіён краіны стаў арыентавацца на стварэнне арыгінальных мясцовых свят – выразнікаў адметных этнічных рыс. У новай святочнай культуры з'явіліся цырыманіяльныя, абрадавыя і відовішчныя дзеі, у якіх акумулююцца традыцыі і навацыі.

Адпаведна з сённяшняй рэальнасцю ў святочнай культуры Беларусі вылучаюцца святы: фальклорныя (вясковыя і гарадскія); экалагічнай накіраванасці; кулінарнай тэматыкі.

Фальклорныя святы заўжды на важным месцы ў духоўным жыцці беларусаў. Адметнасцю сучаснага фестывальнага фальклорнага руху з'яўляецца перамяшчэнне акцэнтаў фестывальнай актыўнасці з цэнтра на перыферыю. Структурныя часткі фальклорных фестываляў – мастацкае відовішча; разнастайныя конкурсы; рэкрэатыўныя пляцоўкі з актыўным удзелам жыхароў рэгіёна. Найбольш вядомыя сярод сучасных фальклорных фестываляў:

– «Купальскае Кола» – штогодні Міжнародны музычны фестываль (з удзелам, да прыкладу, фолк- і метал-гуртоў «Стары Ольса», «Горынь», «Рутвіца» – Беларусь; «Krusher» – Польшча; «Троль гнёт ель» – Расія; «Nokturnal Mortum» – Украіна) (чэрвень, адпачынкавы комплекс «Камарова» паблізу Мінска);

– «Вольнае паветра» – фестываль этна-фолк музыкі (з удзелам, да прыкладу, гуртоў RAWA, ILUZHAN і інш.) (ліпень, хутар «Шаблі», Валожынскі раён);

– «Свята Сонца» – фолк-рок фэст на Купалле (чэрвень, музейны комплекс «Дудуткі», Пухавіцкі раён);

– «Карнавал весялосці» – абласны опэн-фестываль беларускай гульні (верасень, г. п. Воранава, Гродзенская вобласць);

– «Капыльскія пацехі» – абласны фестываль гульні і гумару (кастрычнік, г. Капыль, Мінская вобласць);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– «Зюзя Паазерскі запрашае…» – фальклорна-міфалагічныя гулянні ў сядзібе казачнага Зюзі (г. Паставы, Віцебская вобласць);

– «Кліч Палесся» – Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый (а. г. Ляскавічы, Петрыкаўскі раён).

Адным з папулярных народных свят з'яўляецца кірмаш-гандаль, які суправаджаецца відовішчнымі мерапрыемствамі, забавамі. Яшчэ ў XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі пачаўся працэс спецыялізацыі кірмашоў па відах тавару. У нашы часы ў жыццё беларусаў увайшлі такія фестывалі-кірмашы, як: вішань (Глыбокае), журавін (Столін, Міёры), яблык (Шаркаўшчына), цукерак (Івянец), агурка (Шклоў), хмелю, соладу і вады (Ліда), рыбы (Мінск), мяса (Мінск), малака (Брэст), мёду (па ўсёй Беларусі). Кірмашы праводзяцца ў загадзя абумоўленыя тэрміны. У праграму свята звычайна ўваходзяць: радыёканцэрт на тэму гандлю, выстава-продаж кірмашовага тавару, продаж страў з яго, прысвечаныя яму гульні, песні, танцы, латарэі і інш. Напрыклад, на малочным фестывалі «Воблака свежага малака (Брэст, парк Міру, ліпень, 2016) прапаноўваліся: «малочны» квэст ад кампаніі «Савушкін прадукт», знаёмства з тэхналогіяй вытворчасці малочных прадуктаў, дэгустацыя, майстар-класы па выцінанцы, роспісе печыва, лепцы з гліны, гатаванню страў з малочных прадуктаў, урокі фітнесу і ёгі, «малочная» эстафета, гала-канцэрт, феерверк). Некаторыя кірмашы тэатралізаваныя. Так у драматургічную канву свята «Адвечная ягада журавіны» (в. Альманы, Столінскі раён, кастрычнік, 1991) уведзены такія персанажы, як Восень, Журавіначка. Яны вядуць аповед аб ягадзе, яе карысці, зборшчыках, асаблівасцях збору ў мясцовых умовах на Альманскіх балотах, на журавінавы кірмаш, запрашаюць на канцэрт фальклорных калектываў, ладзяць гульні, латарэю.

Сучасны стан прыроды патрабуе значнай увагі да пытанняў экалогіі не толькі дзяржавы, спецыялістаў, але шырокіх слаёў насельніцтва. Ушанаванне прыроды – неад'емная складовая частка традыцыйнай святочнай культуры на ўсім працягу яе існавання. У сучасных умовах у яе развіцці з'яўляюцца такія новыя формы, як камерцыйныя і гандлёвыя, арыентаваныя на захаванне і рацыянальнае карыстанне прыроднымі рэсурсамі: бізнес-паляванне, бізнес-рыбалка, бізнес-турызм, аўкцыёны, латарэі, гандлёвыя атракцыёны. У значнай ступені яны разлічаны на заможных суайчыннікаў і замежных асоб і маюць на мэце таксама дадатковыя фінансавыя паступленні ў эканоміку краіны, і ў прыватнасці ў галіну прыродакарыстання.

Традыцыйнымі сталі ў Беларусі, да прыкладу, такія масавыя святы, як:

– «Свята лесу» (Свіслач, Гродзенская вобласць, верасень – кастрычнік);

– «Свята кветак» (Шчучын, Гродзенская вобласць, май – чэрвень);

– «Свята птушак» (Тураў, Гомельская вобласць);

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

– «Спораўскія сенакосы» – чэмпіянат Еўропы па касьбе на нізінных балотах (Брэсцкая вобласць, Спораўскі раён);

– штогодні фестываль экатурызму на Аўгустоўскім канале (Гродзенская вобласць).

Пачатак традыцыі экалагічных фестываляў пазначаецца 2004 г., калі ў Свіслачы адбылося першае ў краіне свята лесу. Праграмы такіх свят уключаюць пазнавальныя, відовішчныя, забаўляльныя мерапрыемствы, а таксама разнастайныя кірмашы. На асобных спецыялізаваных пляцоўках («Аздараўленчая», «Паляўнічы лагер», «Лясное возера», «Лясная казка») арганізоўваюцца таргі па продажы: лесапіламатэрыялаў, дрэваапрацоўчых інструментаў, мэблі з дрэва і лазы, хатніх кухонных прылад з дрэва, бандарных вырабаў, драўлянай скульптуры, музычных інструментаў, вырабаў разьбы па косці, футры і адзення з футры, лекавых раслін і напояў, вырабаў з паперы, дзічыны, ягад, грыбоў, рыбы, мінеральнай вады, гаючых гразяў, абутку з лазы, паляўнічых, рыбацкіх, турысцкіх, спартыўных, харчовых тавараў). Сціслa прадставім праграму аднаго са свят лесу.

Адкрывае свята радыёканцэрт «Лясныя напевы», які доўжыцца хвілін 30.

Тым часам пачынаюць працаваць:

– фотагалерэя «Чырвоная кніга Беларусі»;

– лясны заапарк «Белавежская пушча»;

– выставачны комплекс лясных гаспадарак рэгіёна;

– выставы эколагаў, майстроў народных рамёстваў, паляўнічых, работнікаў медыцынскіх і курортных установоў, дзіцячай творчасці;

– кантрактавы лясны кірмаш.

Гадзін у дванаццаць пачынаецца забаўляльна-відовішчная частка:

– «Аб лесе, прыгажосці і натхненні» – фестываль фальклорных калектываў (пляцоўка «Дрэва творчасці»);

– «У гасцях у гаспадыні Прыроды» – гульнёва-забаўляльная праграма (дзіцячая пляцоўка);

– алімпіяда юных эколагаў (паляна «Экалагічная»);

– спартландыя (пляцоўка «Аздараўленчая»);

– конкурс лесарубаў (выставачны комплекс);

– «Жывая вада» (пляцоўка «Лясное возера»).

Арганізуюцца масавыя гульні, атракцыёны.

Апоўдні ладзяцца:

– лясны карнавал (дзіцячая пляцоўка);

– «Экалогія лесу – экалогія душ» – конкурс культарганізатараў;

– выстава-дэгустацыя страў з прадуктаў лесу – конкурс хатніх гаспадынь.

Надвячоркам – праграма больш лірычная, моладзевая:

– «Мілая мая, сонейка лясное...» – вечар бардаўскай песні;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– «Лясная фантазія»;

– парад і конкурс авангарднай моды з лясных футры, воўны, пуху, скуры;

– «Песні Лесу» – дыска-праграма;

– падвядзенне вынікаў свята.

Каля адзінаццаці гадзін, з надыходам цемры запальваецца экалагічны агонь – агонь ачышчэння, у завяршэнне – феерверк.

Кожнае сучаснае свята суправаджаецца частаваннем стравамі нацыянальнай кухні. Паступова гэтая складовая частка святочных праграм вылучылася ў самастойнае свята, як, напрыклад, на фестывалі ў Гродне. Там ужо многа гадоў у рамках Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур ладзяць свята нацыянальных кухань, якое карыстаецца вялікім поспехам. Гэтая тэндэнцыя пачала развівацца ў іншых рэгіёнах, а таксама свае святы нацыянальных страў пачалі ладзіць дыяспары. Так, у Моталі (Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці) з'явілася штогоднее свята нацыянальных традыцый «Мотальскія прысмакі».

У праграме – мерапрыемствы, якія арганізуюцца на некалькіх пляцоўках:

– тэатралізаваная дзея – віншаванне старажытных дынастый Скірмунтаў і Бона Сфорца;

– дэфіле «Адзенне з бабулінага куфэрка»;

– старадаўнія мясцовыя гульні і конкурсы («Ступка-галубка» і інш.);

– выставы народнай творчасці, народнай кухні, правядзенне бяспройгрышнай латарэі, выстава-продаж «Мотальскі кажух», продаж мясцовых сувеніраў;

– майстар-клас па разбіранні кабанчыка;

– выставы кулінарных вырабаў, караваяў, бліноў, усіх рэквізітаў, звязаных з выпечкай і захоўваннем хлеба. Выстава-продаж караваяў. Выстава мотальскіх пірагоў, каржоў, вясельнай выпечкі;

– конкурс маладых гаспадынь;

– урачыстае закрыццё фестывалю, падвядзенне вынікаў, уручэнне дыпломаў і каштоўных падарункаў. Гала-канцэрт.

На заканчэнне феерверк.

Адметнай з'явай стала з'яўленне ў Мінску грузінскага свята «Тбілісоба» (2015, 2016, жнівень) з продажам грузінскіх нацыянальных страў: хачапуры, шашлыкоў, сацыві і інш.

Такім чынам, новым сучасным святочным формам уласцівы:

– масавасць;

– захаванне і развіццё народных (гісторыка-культурных) традыцый;

– наяўнасць інтэрактыўных пляцовак для ўсіх узроставых катэгорый;

– тэатралізацыя святочнай дзеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасныя святы ствараюць новае аблічча сваёй эпохі, адлюстроўваюць развіццё эстэтычных, маральных, этнічных, светапоглядных крытэрыяў у грамадстве, тэндэнцыі памкненняў, ідэалаў, існуючых у пэўнай супольнасці.

*N. Gud, P. Gud*

**New birth of traditional holiday culture of Belarus: traditions and innovations, tendencies of development**

*In the early 90-ies of the last century the independent Belarus faced the task of reviving spiritual values and ideals of life, from which many generations of the Belarusians were alienated. The value of this work lies not only in the preservation and reproduction of traditional culture, but also in the understanding of its key role as the guarantor of the existence of the ethnic group.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 16.11.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ